# “Белая Русь” Воранаўшчыны прыняла ўдзел у выніках работы ідэалагічна-культурнай супольнасці за 2017 год




Ідэалагічна-культурная супольнасць Воранаўшчыны падвяла вынікі работы за 2017 год. У паседжанні савета аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама прынялі ўдзел Аляксандр Вярсоцкі — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама, Мікалай Розум — кіраўнік раёна, Віктар Роік — старшыня райсавета дэпутатаў, Андрэй Карповіч — намеснік старшыні Воранаўскага райвыканкама. Былі запрошаны таксама і старшыні грамадскіх аб’яднанняў Воранаўшчыны.




Старшыня Воранаўскай раённая арганізацыі РГА “Белая Русь” Леанід Адамоніс рассказаў аб дзейнасці раённай арганізацыі па рэалізацыі статутных мэтаў і задачах аб'яднання. У выступленні было адзначана, што 2017 год быў насычаны цікавымі акцыямі, мерапрыемствамі. Дзейнасць раённай арганізацыі была накіравана на падтрыманне стабільнай грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай абстаноўкі ў раёне.

Лідэр раённай арганізацыі “Белая Русь” падзякаваў актывістам арганізацыі за намаганні, за актыўны ўдзел ў грамадскім жыцці раёна і дзейнасці арганізацыі.




Падчас мерапрыемства ганаровыя граматы, падзячныя пісьмы і іншыя ўзнагароды атрымалі многія працаўнікі культурнай і ідэалагічнай сферы, актывісты грамадскіх аб’яднанняў. Ганаровай граматы галоўнага упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах молодзі Гродзенскага аблвыканкама ўдастоены старшыня раённай арганізацыі “Белая Русь” Леанід Адамоніс. Таксама падзяку атрымалі і актывісты раённай арганізацыі.




